# Урок матэматыкі ў 1 класе
# Матэматычная казка

**Тэма:** Замацаванне.

**Задачы:**

замацоўваць уменнне называць лікі ў парадку павелічэння і ў парадку памяншэння;

замацоўваць уменнне павялічваць і памяншаць лікі на 1;

замацоўваць веданне саставу вывучаных лікаў;

замацоўваць уменне параўноўваць лікі ад 1 да 5;

практыкаваць складанне і адніманне лікаў у межах пяці на практычнай аснове;

садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення, увагі, кемлівасці;

выхоўваць актыўнасць, уважлівасць, дысцыплінаванасць.

**Абсталяванне:** падручнік "Матэматыка" 1 клас, 1 частка (аўтар Г.Л.Мураўёва, М.А.Урбан), рабочы сшытак на друкаванай аснове, мяч, карткі, малюнкі Машы, Мядзведзя, Вожыка, Зайца, Ваверкі, домікі з саставам лікаў 2, 3, 4, 5, грыбочкі, шышкі.

## Ход урока

### І. Арганізацыйны момант

***Стварэнне псіхалагічнага настрою***

Вітаю вас, мае вучні, давайце разам праверым гатоўнасць да ўрока.

**Настаўнік**. Рукі?

**Вучні**. На месцы!

**Настаўнік.** Ногі?

**Вучні.** На месцы!

**Настаўнік.** Лакаточкі?

**Вучні.** З краю!

**Настаўнік.** Спіна?

**Вучні.** Прамая.

**Настаўнік.** Цудоўна!

А каб у вас усё атрымалася, успомнім правілы, якія мы павінны выконваць на ўроку (на дошцы):

1. Правіла паднятай рукі (ведаеш – падымі руку).
2. Правіла цішыні (цішыня і парадак дапамагаюць слухаць).
3. Працуем дружна.
4.Слухаем уважліва.
5. Адказваем правільна.

### ІІ. Паведамленне тэмы і мэт урока

Сёння мы будзем павялічваць і памяншаць лікі на 1, успомнім састаў вывучаных лікаў.

**III. Актуалізацыя ведаў і ўменняў навучэнцаў**

Я запрашаю вас у матэматычную казку**.**

Пагуляем у гульню "Угадай мелодыю" (некалькі фрагментаў мелодый з мультфільма "Маша і Мядзведзь"). Паслухайце, будзьце ўважлівы.

- Адкуль гэтыя мелодыі?
- Што іх аб'ядноўвае?

Вось гэтыя героі завіталі да нас на ўрок. Маша і Мядзведзь жывуць у прыгожым казачным лесе.

Маша ў нас дзяўчынка вельмі смелая, хуткая, дапытлівая. Яна заўсёды недзе спяшаецца, хоча ўсё даведацца, але ў адрозненні ад Мядзведзя, яна не вельмі старанная.

Але вы павінны помніць, што на ўроку матэматыкі мы павінны быць актыўнымі, уважлівымі, каб не прапусціць Машыных памылак.

Давайце, дзеці, дапаможам Машы выканаць заданні Мядзведзя. Гатовы? Прыступім!

**IV. Вуснае лічэнне**

1. *Заданні Мядзведзя*

*Рубрыка "Цікава ведаць"*

- Дзеці, а што вы ведаеце пра мядзведзя?

Мядзведзі нараджаюцца вельмі маленькімі, важаць не больш 200-700г, сляпыя, бяззубыя і амаль безвалосыя. У казках мядзведзь непаваротлівы, а на самай справе, ён вельмі добра бегае, умее плаваць, лазіць па дрэвах.

*Мішка падрыхтаваў нам заданні на шышках*

Палічыце ад 1 да 20 і ў адваротным парадку.

Палічыце ад 3 да 10, ад 17 да 9, ад 11 да 20, ад 10 да 6.

Назавіце лік, які ідзе за лікам 4, 13, 19.

Назавіце лік, які стаіць перад лікам 5, 16.

Які лік стаіць справа ад 5, злева ад 8?

Які лік стаіць паміж лікамі 3 і 5, 8 і 9?

Назавіце суседзяў ліку 8, 12, 17?

- На якіх дрэвах растуць шышкі?

Справіліся? Малайцы.

А цяпер завітаем у домік Мядзведзя, але і тут не ўсё так проста.

Паўторым састаў лікаў 2,3,4,5.

5 – гэта 4 і ?

4 – гэта 3 і ?

3 – гэта 2 і ?

2 – гэта 1 і? (вучні прапаноўваюць свае лікавыя выразы)

Малайцы!

2. А зараз пагуляем на палянцы ля Мішкавага доміка. Дзеці, як трэба сябе паводзіць у лесе.

*Правілы паводзін у лесе:*

1. *Не шумім, ціха паводзім сябе.*
2. *Не астаўляем смецце.*
3. *Не зрываем кветкі.*
4. *Не ламаем галінкі кустоў і дрэў.*

Я буду кідаць вам мяч, а вы даеце адказ:

| | | |
|---|---|---|
| 5-1= | 10-5= | 5+5= |
| 3+3= | 10-6= | 2+2= |
| 6+4= | 10-3= | 10+7= |

3. А гэтыя прыклады Маша палічыла па-свойму, давайце праверым Машу (*прыклады размешчаны на дошцы, потым правяраем і знімаем).*

| | | |
|---|---|---|
| 5+0=5 | 5-1=3 | 5-4=2 |
| 4-2=3 | 5+5=10 | 4-3=2 |

- Ці ўсё правільна зрабіла Маша?

4. Пакуль мы з вамі правяралі, Маша з Мядзведзем назбіралі многа грыбоў. Грыбочкі гэтыя не простыя, з сакрэцікам, а што за сакрэцік, давайце вызначым. (*Яны з заданнем, трэба паставіць* >,<,=). Вучні бяруць адзін грыбок, зачытваюць (5>4, 3<4 і г.д.).

- Дзеці, якую памылку дапусціла Маша?
- Ці ўсе грыбы можна збіраць?

5. Дзеці, а хто гэта там за дрэвам выглядае *(вожык)*. Вожык вельмі не любіць, калі Маша псуе яго грыбы і ягады.

- Дзеці, а што вы ведаеце пра вожыка?

*Рубрыка "Цікава ведаць"*

Вожыкі з'явіліся на планеце Зямля вельмі даўно. Яны вельмі хутка перамяшчаюцца. Вожыкі кормяцца ўсім, што знаходзяць і могуць больш за ўсіх звяроў абыходзіцца без ежы. Яны нараджаюцца вельмі маленькімі і з мяккімі белымі іголкамі. Іголкі для вожыка як поўсць для другіх звяроў.

Давайце рашым задачу пра вожыка:

Вожык тата ў лес пайшоў
Для сям'і сабраць грыбоў.
Два знайшоў ён пад рабінкай
І чатыры пад асінкай.
Дык колькі тата-вожык
Паклаў грыбоў у кошык?(6)

Малайцы! Вы добра справіліся з гэтымі заданнямі. Дапамаглі Машы. Мядзведзь вельмі задаволены вамі.

**V. Замацаванне вывучанага матэрыялу**

А зараз мы звяртаемся да нашага вернага сябра – падручніка.

***Работа з вучэбным дапаможнікам***

*Заданні Зайца, які хацеў нарваць морквы ў мядзведзевым агародзе.*

- Дзеці, а што вы ведаеце пра зайчыка?

*Рубрыка “Цікава ведаць”*

Зайцы - траваедныя жывёлы. Яны сілкуюцца толькі раслінннай ежай: лісцем, сцебламі, каранямі, карой маладзенькіх дрэў, пладамі. Ядуць і грыбы, але самы любімы іх ласунак - кара асіны. Зубы ў зайца вялікія, плоскія - для харчавання, а не для нападу. Ззаднія лапы нашмат большыя за пярэднія. Таму заяц добра скача. На працягу года зайцы перыядычна ліняюць. Узімку яны становяцца белымі, як снег. Гэта для таго, каб ворагі зайца не маглі знайсці яго.

1) с.50, №1

Суаднясенне схем з выразамі “4 паменшылі на 1 і 4 павялічылі на1”. На партах састаўляць роўнасці 4-1=3 і 4+1=5

2) с.50, №4

Вучні дапаўняць схемы, якія ілюструюць састаў вывучаных лікаў.

Вучні называць (зачытваць) свае варыянты.

3) с.51, №6

Чытаю ўмову задачы.

- Колькі машын было?
- Колькі машын прыехала?
- Колькі машын стала?

Падбярыце выраз, які падыходзіць да прапанаванага тэксту.

Зайчык вельмі задаволены вашай работай! Малайцы! Закрылі падручнік. Паклалі на край парты.

Стамілася Маша з Мядзведзем, давайце, дзеткі, адпачнем разам з імі.

Фізкульхвілінка з музыкальным суправаджэннем

Селі за парты ціха, спінкі прамыя – прыступаем да работы!

А зараз папрацуем у нашых сшытках.

***Работа ў рабочым сшытку***

*Заданні Вавёрачкі*

- Дзеці, а што вы ведаеце пра вавёрачку?

*Рубрыка “Цікава ведаць”*

Вавёрачка - дробны звярок з выцягнутым стройным целам і пухнатым хвастом. Нованароджаныя ваверчаняты голыя і сляпыя, масай каля 8 г. Валасяное покрыва ў іх з'яўляецца на 14 суткі, пачынаюць бачыць толькі на

30—32 дзень. З гэтага моманту пачынаюць выходзіць з гнязда. Малаком харчуюцца да 40—50 дзён. Ва ўзросце 8—10 тдняў пакідаюць маці.

(Пасля кожнага задання настаўнік называе крытэры, па якому будзе ацэнена работа).

Вавёрачка прапануе вам па кропках правільна прапісаць лічбы

1) С.28, №1

Я свой сшытак разгарну,

Веярочкам пакладу.

І ад вас я не схаваю,

Ручку я вось так трымаю.

Сяду роўна, не хілюся,

І ў рабоце не стамлюся.

Ножкі роўненька стаяць,

Каб у працы не перашкаджаць.

Усе запісы будем выконваць, дзеці, прыгожа, правільна, акуратна.

2) С.28, № 2

Маша спатыкнулася, калі несла малюнкі і адпаведныя літаркі, і зноў паспяшыла, і ўсё пераблыталася.

- Якім лікам не хапіла малюнка?

Трэба злучыць малюнак і адпаведны лік, якога не хапае *(у рамачцы намаляваць 2 лісточкі, 3 грыбочкі).* Гатовы? Прыступім!

3) С.28, № 3 *(самастойная работа)*

Паменшыце лікі на 1і запішыце адказ у пустыя акенцы.

*Работа ў парах*

Напаміню правілы паводзін ў пары:

1. Працаваць дружна.
2. Слухаць адзін аднаго.
3. Не сварыцца.
4. Дапамагаць адзін аднаму.

Праверце правільнасць выканання работы ў свайго суседа па парце, ацаніце яго работу (*дзеці, ацаніце сваю работу ручкай і работу сябра простым алоўкам на чароўнай лінеечцы поспеху, памятайце пра акуратнасць*).

**VI. Падвядзенне вынікаў урока**

Вось і закончылася наша матэматычная казка. Разам мы справіліся з усімі заданнямі, якія падрыхтавалі казачныя героі.

- Пералічыце іх?
- Хто лішні? Чаму? *(гэтыя жывёлы водзяцца ў нашых лясах)*
- Як атрымалі лік 5?
- Павялічце лік 5 на 1?
- Які лік атрымаецца? *(з лікам 6 мы пазнаёмімся на наступным уроку)*

Я і казачныя героі вельмі задаволены вашымі адказамі: умееце павялічваць і памяншаць лікі на 1, ведаеце састаў вывучаных лікаў, умееце дапамагаць сваім сябрам.

**VII. Рэфлексія**

Нашы казачныя героі адпраўляюцца да сябе дамоў. Але ім вельмі цікава, ці спадабаўся вам наш урок? Ацаніце сваю работу з дапамогай смайлікаў (1-рад, потым 2-рад):

 - на ўроку было лёгка і цікава;

 - на ўроку было цікава, але некаторыя заданні вызвалі цяжкасць;

 - не ўсё атрымалася, узніклі цяжкасці, трэба яшчэ папрацаваць.